ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

25 КРАСАВІКА 1996 года чацвер

№7 (1743)

## ВЕДЫ І АЎТАРЫТЭТ



НА ЗДЫМКУ: ПЕРШЫ ВЫПУСК ЮРЫСТАЎ-МІЖНАРОДНІКАЎ (ЗЛЕВА НАПРАВА) ШЛОПАК А.Р., ШЫХАЎ Б.А., ЖАЎНЕРАЎ С.Ф., ШПЕНДЗІК Я.С.,, КРАЎЧУК І.М., ГРЫБ В.І., БЕЙШЫС А.А., СТРАХ І.А., ПУКАЛА Ў.Ф., КУНЕВІЧ Г.Г., ХЛІМАНКОЎ Ю.А., ГАНЧАРОЎ А.А., КУДЗІЕЎ В.В., КРУПАЧЭНКА Ю.А., АНДРУШКА Ю.А., ЮРЧУК В.В., БАКУМЕНКА А.Э., ЗОТАЎ Р.В., ІСАКАЎ С.П., ПЕТРАЧЭНКАЎ Д.У., ШПЕНДЗІК В.Ф., ВІШНЕЎСКІ А.І., ІВАНОЎ У.А., ГЛАДКОЎ У.М., АПАНАСЕНКА Г.В., БАБРУЙСКІ Ю.А., ПУСТАВІТ А.В., СЕРПІКАЎ У.М., ЛАПША І.М., ЧАРНЕНКА А.Д.

## ДАЎ НАМ УНІВЕРСІТЭТ

Нагляднай адметнасцю сённяшняга міжнароднага працэсу з'яўляецца паглыбленне і развіццё эканамічнага супрацоўніцтва паміж дзяржавамі. У цяперашніх умовах сусветная гаспадарка становіцца адзіным арганізмам, асобна ад якога не можа функцыянаваць ніводная краіна.

Рэспубліка Беларусь пасля набыцця ёю дзяржаўнага суверэнітэта замацавала на міжнароднай арэне свае палітычныя, эканамічныя і культурныя сувязі. Беларускія юрыдычныя і фізічныя асобы атрымалі магчымасць самастойна ажыццяўляць знешнеэканамічную дзейнасць, ствараць сумесныя прадпрыемствы з замежнымі партнёрамі, утвараць разнастайныя фонды, займацца інвестыцыйнай дзейнасцю за мяжой.

Веданне міжнароднага права, пры дапамозе якога ажыццяўляецца прававое рэгуляванне дзелавых сувязяў паміж суб'ектамі гаспадарання розных краін, з'яўляецца неад'емнай часткай сучаснай вышэйшай юрыдычнай адукацыі. Нельга быць паўнацэнным юрыстам, не валодаючы асновамі міжнароднага права.

Першы выпуск юрыстаў-міжнароднікаў завочнага аддзялення адбыўся ў нашым універсітэце. Да фінішу прыйшлі самыя настойлівыя і мэтанакіраваныя. За гэта сведчаць лічбы: з 82 чалавек, якія паступілі чатыры гады таму, юрыстамі сталі 34.

Вывучэнне міжнароднага права ўяўляе пэўныя складанасці, галоўная з якіх — веданне замежнай мовы. Нашаму курсу пашанцавала. Ізабэла Сяргееўна Бігільдзіна, Ірына Васільеўна Крукоўская, Вольга Іванаўна Васючкова, канешне ж, не без цяжкасцей вывелі свае групы на той неабходны ўзровень, які дазваляе досыць вольна карыстацца юрыстам у сваёй дзейнасці замежнай літаратурай.

Усе прававыя дысцыпліны (а іх каля 30) былі складанымі ў разуменні і засваенні. Дзякуй высокваліфікаваным выкладчыкам дзесяці кафедраў, з якімі нам пашчасціла сустрэцца за час навучання. Валянціна Сцяпанаўна Бранавец кампетэнтна ўвяла нас у курс агульнай тэорыі права, Варвара Уладзіміраўна Сажына дасканала азнаёміла з гісторыяй дзяржавы і права замежных краінаў. І цяжка знайсці канкурэнтаў па ўменню данесці слухачам інфармацыю па гісторыі і праву Беларусі, а таксама па яе міжнароднаму праву Таісіі Іванаўне Доўнар і Юрыю Пятровічу Броўку. На лекцыях па канстытуцыйнаму праву Анатоля Аляксандравіча Галаўко былі ўвага і засяроджанасць студэнтаў. Прафесар, карыстаючыся багатым жыццёвым і юрыдычным вопытам, так будаваў лекцыі, што цікавасць не слабела з першай да апошняй хвіліны заняткаў.

Цяжкая навука рымскага грамадзянскага права. Але толькі не з Уладзімірам Андрэевічам Раманенкам, гэтаксама ж як і вывучэнне грамадзянскага права Рэспублікі Беларусь з мудрым педагогам Васілём Фёдаравічам Чыгіром.

Валодаць асноўнымі прынцыпамі міжнароднага права — гэта значыць грунтоўна вывучыць дзяржаўнае права замежных краін. І тут нам пашанцавала з выкладчыкамі. Людміла Аляксееўна Прыходзька і Міхаіл Філіпавіч Чудакоў дружным тандэмам прымусілі і нас напружана папрацаваць. Нялёгка давялося нам і засваенне адміністратыўнага і працоўнага права замежных краін. Але і тут маладосць і азарт педагогаў Аляксандра Уладзіміравіча Карамышава і Вольгі Сяргееўны Курылёвай натхнялі студэнтаў, надавалі ім аптымізму.

Дылетанту здалося б, што такія дысцыпліны, як міжнароднае эканамічнае права і міжнародныя эканамічныя арганізацыі,— адно і тое ж. Але Віктар Нікіфаравіч Ухванаў і Валянціна Васільеўна Мігас паспяхова даказалі няслушнасць такога погляду.

Сучасны юрыст-міжнароднік ніяк не можа абысціся без сучасных дысцыплінаў — маркетынгу, біржавай справы, менеджменту. Тым болей, калі такія патрэбныя прадметы чытаюцца сучаснымі выкладчыкамі — Аляксандрам Уладзіміравічам Вараб'ёвым, Галінай Іванаўнай Аляхновіч, Людмілай Паўлаўнай Ермаловіч. Багаты практычны матэрыял гэтых настаўнікаў дазваляў "чуць палёт мухі ў аўдыторыі".

Кампетэнтным і патрабавальным выкладчыкам выявіла сябе Ірына Мікалаеўна Шчамялёва: пасля здачы ёй "банкаўскага права" кожны з нас запраста можа наймацца на службу ў сферу банкаўскай сістэмы, скарыстаўшыся ўдабавак паглыбленымі ведамі па фінансаваму праву, атрыманымі ў Таццяны Сямёнаўны Бойка.

Прайсці курс навучання ва універсітэце і не пазнаёміцца з дэканам юрыдычнага факультэта Валерыем Мікалаевічам Гадуновым было б па меншай меры не этычна для будучага юрыста. Знаёмства, а ў некаторых і неаднаразовае, адбылося пры здачы заліку "Дагаворна-прававы механізм знешнеэканамічнай дзейнасці". Адбылося знаёмства і з намеснікам дэкана Уладзімірам Міхайлавічам Хомічам, якому мы здавалі параўнаўчае крымінальнае права.

Чым больш дасведчаны выкладчык, тым больш шчырая размова на экзамене. Так атрымалася ў Мікалая Рыгоравіча Юркевіча, які выкладаў нам міжнародны грамадзянскі працэс. І, канешне ж, не забыць студэнтам дзвюх маладых настаўніц — Нонну Аляксандраўну Урублеўскую (міжнароднае экалагічнае права) і Наталлю Аляксееўну Казакевіч (мытнае права).

За час навучання стала блізкай усім нам кафедра міжнароднага права, якой загадвае Людміла Васільеўна Паўлава. Намаганнямі Паўла Кірылавіча Знаўца, Алены Барысаўны Леановіч, Таццяны Яўгенаўны Ушаковай, Барыса Іванавіча Жарліцына, Галіны Пятроўны Ляўко кафедра падарыла нам букет ведаў з дысцыплін "Міжнароднае публічнае права", "Дыпламатычнае і консульскае права", "Міжнароднае прыватнае і гуманітарнае права".

Паступова, набіраючы абароты, жаў студэнцкі камбайн ніву ведаў, вызначаную навучальным планам. Былі змены, дапаўненні, карэкціроўкі. Але ў цэлым усё прайшло паспяхова. Хочацца падзякаваць усім, а асабліва намесніку дэкана юрыдычнага факультэта Анатолю Аляксандравічу Данілевічу, метадысту Алене Мікалаеўне Закрэўскай і сакратару Ірыне Віктараўне Елістратавай. Менавіта гэтым тром мы дастаўлялі больш за ўсё клопатаў і цяжкасцей. Студэнцкі шлях пройдзены, спецыялісты адбыліся. Хочацца верыць, што наша краіна ў хуткай будучыні павялічыць свае поспехі, карыстаючыся намаганнямі і атрыманымі ведамі новаспечаных юрыстаў.

*Валерый Грыб, стараста курса завочнага аддзялення юрыдычнага факультэта*

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

*аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:*

Загадчыкаў кафедраў: класічнай філалогіі, замежнай літаратуры, славістыкі, міжнародных эканамічных адносін, англійскай мовы, рамана-германскіх моў;

Прафесара кафедры тэлебачання і радыёвяшчання;

Дацэнтаў кафедраў: матэматычнай фізікі, аналітычнай хіміі, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, паліталогіі, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, эканамічных навук, этыкі і эстытыкі, міжнародных эканамічных адносін (0,25 стаўкі), міжнародных адносін, англійскай мовы, сусветнай і айчыннай гісторыі, гісторыі журналістыкі і літаратуры, тэлебачання і радыёвяшчання, інфарматыкі;

Старшых выкладчыкаў кафедраў: матэматычнага забеспячэння АСК, матэматычных метадаў тэорыі кіравання, прыкладной лінгвістыкі, міжнародных эканамічных адносін, англійскай мовы, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, тэорыі і практыкі сучаснай журналістыкі;

Выкладчыкаў кафедраў: англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, міжнародных эканамічных адносін (0,25 стаўкі), міжнароднага права, рамана-германскіх моў, нямецкай мовы, сучаснай беларускай мовы, беларусазнаўства, гісторыі беларускай літаратуры;

Асістэнта кафедры ядзернай фізікі.

Тэрмін конкурсу -- адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г.Мінск, праспект Ф.Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, тэл. 26-59-39.

Аб'ява надрукавана ў газеце "Беларускі універсітэт" 25 красавіка 1996 года.

# Выйсце?..

"Прайшоўшы курс семінару па тэме алкагольнай залежнасці, мне захацелася падзякаваць арганізатарам за прадстаўленую магчымасць атрымання новых ведаў. Я ўсвядоміла, адчула, што за з'ява алкагалізм, якія могуць быць выйсці з жыццёвага тупіка для асобаў, якія апынуліся ва ўладзе алкагольнага палону. Людзі, якія працавалі з намі ў працэсе семінару, спрыялі больш глыбокаму і яснаму бачанню праблемы алкагольнай залежнасці."

"Думаецца, што мой удзел у гэтым семінары быў невыпадковы. Гэта было яшчэ адным промнем, які асвятліў шлях усведамлення прыроды і ролі духоўнасці ў жыцці чалавека. Я па-новаму ўспрыняла ідэю ўдзелу чалавека ў сваім лёсе."

"Хацелася б паболей даведацца аб дзейнасці такіх арганізацыяў як Ал-Анан (дзейнасць якой заключаецца ў дапамозе сем'ям і блізкім тых, хто пакутуе ад алкагольнай залежнасці) і Ал-Ацін (дапамога дзецям, у якіх п'юць бацькі). Вельмі зацікавіла праграма "12 крокаў"..."

Такія водгукі пакінулі студэнты 5-га курса ФЭФа аддзялення сацыялогіі пасля таго, як аказаліся ўдзельнікамі семінару "Духоўнае вылячэнне", праведзенага Цэнтрам Даверу "Надзея і вылячэнне". Многія з іх яшчэ не ведаюць, у якой галіне (будзь тое сацыялогія, псіхалогія) давядзецца працаваць, але відавочна, што праца будзе звязаная з людзьмі, і таму яшчэ не раз у жыцці давядзецца сутыкнуцца з праблемай алкагалізму, і не проста з праблемай, а з сапраўднай бядой, перад якой у многіх маці, жонак, дзяцей даўно апусціліся рукі. Аднак бывае момант, калі чалавек шукае дапамогі, і, магчыма, своечасова працягнутая рука стане своеасаблівым пачаткам змянення жыцця алкаголіка.

Чалавек п'е. Сёння яго яшчэ ніхто не назваў алкаголікам. Але цяга да спіртнога і залежнасць ад яго ўжо існуюць. І нават калі чалавек усведамляе гэта, то ўжо наўрад ці зможа справіцца сам. Патрэбна дапамога, патрэбна падтрымка, фізічная і маральная. Нехта цягнецца ў цэнтры, дзе абяцаюць вылечыць ад алкагалізму за адзін дзень. Нехта паспрабаваў кадаванне, але зноў і зноў вяртаўся да алкаголя. А нехта і сам не прызнаецца сабе, што без спіртнога ўжо не можа. Куды звярнуцца па дапамогу, дзе шукаць выйсце?

Алкагалізм — гэта хвароба. Стваральнікі праграмы "12 крокаў", у аснове якой ляжыць вопыт утворанага ў 1935 годзе таварыства АА (ананімных алкаголікаў), сцвярджаюць, што алкаголіка нельга вылечыць. Яго можна навучыць жыць. Дапамагчы вырашыць свае праблемы, якія чалавек часта вырашае пры дапамозе спіртнога. Дапамагчы іначай зірнуць на свет, пераглядзець каштоўнасці. Праграма не навязвае, яна ўсяго толькі прапануе выйсце.

Думаю, што нехта выкажа неўразуменне: "У якой ступені гэта тычыцца мяне, навошта мне гэта ведаць?" Сапраўды, краіна ў нас з алкагольнай традыцыяй — на святы і ўрачыстаці прынята "прапусціць" чарку-другую. Выпіваюць, бадай, усе.

Аднак факт, пацверджаны сусветным вопытам, сумны: алкагалізм — патэнцыяльная хвароба тых, хто п'е, хай і патрыху. На Захадзе тэлефон таварыства АА пішуць перад тэлефонамі хуткай дапамогі і паліцыі. У нас жа, у Беларусі, праграма "12 крокаў" толькі пачынае сваё жыццё.

*П.Грушына*

---

*Фестывалі*

**Камітэт Саюза моладзі Беларусі Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфармуе, што 17-19 мая ў Вязыпцы адбудзецца студэнцкі фестываль "Белдзяржуніверсітэт-96", прысвечаны 75-й гадавіне БДУ.**

---

# "Смерць — доля слабейшых"

У Беларусі за мінулы год скончылі жыццё самагубствам 3152 чалавекі. Прыкладна адну трэць гэтай лічбы складаюць маладыя людзі. Аб тым, чаму моладзь пазбаўляе сябе жыцця, разважае псіхолаг Мінскай службы даверу **Аляксандр Андрэеў:**

— Прынята лічыць, што самагубства — пазбаўленне ад цяжкіх пакутаў. Часамі ўсе мы ўпадаем у крызісны стан. Унутры нешта спыняецца, атупляючы розум. Некаторыя аказваюцца больш слабымі і, замест таго, каб узяць сябе ў рукі, толькі пагаршаюць сітуацыю адчайнымі ўчынкамі, нібыта даказваючы сабе недарэчнасць жыцця. У гэты момант раззлаванаму чалавеку цяжка стрымаць сябе, асабліва калі звонку ніхто не падтрымлівае. Гэта можа быць добры сябар, каханы чалавек, нават музыка, якая дазваляе расслабіцца. Наогул, штосьці лёгкае, прыемнае.

У іншым выпадку думка аб смерці можа стаць навязлівай, асабліва для тых, хто цешыць сябе гарэлкай. Нават калі дэпрэсія затухае, няма ўпэўненасці, што гэта не паўторыцца зноў. Таму вельмі важна "разгадваць" сябе, каб ведаць, як пазбавіцца ад непрыемных эмоцыяў. У жыцці няма нічога непапраўнага, акрамя смерці.

**— А калі дэпрэсія выклікана адзінотай?**

— Ніхто не забараняе знаходзіць сяброў, кахаць і пасміхацца. Значыць, уся праблема ў самім сабе, у поглядах на жыццё. Іншая справа, калі чалавек самотны сярод сяброў, не знаходзіць разумення і любові сярод блізкіх. Мне здаецца, гэта — сапраўдная адзінота. Лепшае выйсце — самому стварыць разуменне, пайсці на нейкія ўступкі.

**— Але падлетку, напэўна, вельмі цяжка ацаніць сітуацыю!..**

— Галоўнае — прыслухацца да свайго сэрца, яно ж не хоча паміраць, пакутуючы ў адзіноце. Вельмі важна ўсвядоміць свае каштоўнасці, тое, да чаго трэба імкнуцца. Гэта не модныя рэчы, якія ёсць у сяброў, не начныя дыскатэкі. Без гэтага можна быць шчаслівым.

**— Аднак і пазбаўленне нейкіх каштоўнасцей можа стаць нагодай для смерці. Непадзеленае каханне, напрыклад...**

— Шчырае пачуццё — гэта цудоўна. Але калі нешта не атрымліваецца, трэба цвяроза паглядзець на рэчы. Пагадзіцеся, смерць у гэтым выпадку не выражае сапраўднасці пачуццяў. Важна цаніць сябе як асобу. Чалавек папросту абавязаны ўмець пачынаць спачатку і рабіць усё лепей, чым раней. Сілаў хопіць кожнаму. Трэба толькі гэта зразумець.

*Размаўляў Аляксей Максюкоў*

---

*ДАІ паведамляе*

За тры месяцы 1996 года ў Мінску адбылося 149 дарожна-транспартных здарэнні (ДТЗ), пры гэтым загінулі 18, параненыя 150 чалавек.

У сакавіку ў Маскоўскім раёне адбылося 6 ДТЗ, у якіх пацярпелі 6 чалавек.

Электраманцёрам БДУ Мілько Уладзімірам Віктаравічам 29 сакавіка былі парушаныя Правілы дарожнага руху, у выніку чаго адбылося ДТЗ, за якое яму давялося заплаціць штраф у памеры 150 тысяч рублёў.

14 сакавіка 1996 года ДТЗ здзейсніла метадыст БДУ Кулікова Жаньета Вітальеўна. З месца здарэння яна з'ехала, яшчэ раз парушыўшы Правілы дарожнага руху.

Студэнт БДУ Русаловіч Андрэй Аляксандравіч 18 сакавіка аштрафаваны на 5000 рублёў за пераход вуліцы ў неўстаноўленым месцы.

Мы звяртаемся да супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ: добра вывучыце і засвойце Правілы дарожнага руху, не парушайце іх.

*Дзяржаўтаінспектар ДАІ А.Кудраўцаў*

---

# 02!.. Укралі машыну!

Такія паведамленні часта паступаюць у міліцыю. Паспрабуйце зразумець чалавека, які пакінуў свой аўтамабіль ці матацыкл, каб адысці на хвіліну ці даўжэй, і ... не знайшоў машыну пры вяртанні.

Куды і чаму знік транспарт? Дзе ён цяпер, у якім стане? Хто яго ўгнаў? З гэтымі пытаннямі звяртаюцца ў міліцыю ўсе, хто апынуўся ў такой бядзе. Абсалютную большасць угнаных машынаў знаходзяць. Але бывае і так, што, трапіўшы ў рукі ўгоншчыка, аўтамабіль або матацыкл разбіраецца на запчасткі.

У руках угоншчыка аўтамабіль ці матацыкл уяўляе сур'ёзную небяспеку для навакольных. Спрабуючы пазбавіцца пагоні, угоншчык груба парушае правілы бяспекі руху, пачасту знаходзіцца ў стане ап'янення. Нярэдка ўгоншчыкі ажыццяўляюць дарожна-транспартныя здарэнні з цяжкімі наступствамі.

Так, 13 лютага гэтага года нарадам ДПС ДАІ Маскоўскага раёна Мінска каля дома 22 на праспекце газеты "Правда" на месцы здзяйснення ДТЗ быў затрыманы курсант другога курса Ваеннай Акадэміі МА РБ Алег Ш. у стане алкагольнага ап'янення. У 00.05 ад дома № 1 па вуліцы Голубева ён угнаў тралейбус маршрута 53 і, не авалодаўшы кіраваннем, сутыкнуўся з тралейбусам маршрута 64. У адносінах Алега Ш. распачатая крымінальная справа.

Лягчэй прадухіліць угон. Існуе некалькі спосабаў і сродкаў супрацьдзеяння ўгонам аўтатранспарту.

Перш за ўсё неабходна забяспечыць надзейную ахову транспарту. Для гэтага аўтамабіль ці матацыкл павінен знаходзіцца на стаянцы з аховай ці ў закрытым гаражы. Не дапускаецца пакідаць дзяржаўны транспарт у двары ці на вуліцы паблізу ад месца жыхарства вадзіцеля.

Кожны аўтамабіль ці матацыкл павінен быць абсталяваны супроцьугоннай прыладай, якая выключае доступ у машыну пабочных асобаў, запуск імі рухавіка і г.д.

Уладальнікі транспарту! "Аўтавартаўнік" павінен быць кампактным і бясшкодным пры прывядзенні яго ў дзеянне.

*Інспектар прафілактыкі Маскоўскага РАУС г.Мінска лейтэнант міліцыі Мацко С.М.*

---

# А на Кіпр слабо?..

**З незабыўнымі ўражаннямі вярнулася нядаўна група студэнтаў БДУ са старадаўняга Кіева. Цудоўную магчымасць адпачыць стомленым навучальным працэсам стдэнтам прадаставіла Мінскае бюро экскурсій і падарожжаў.**

**Праезд цягніком, гасцініца, двухразовае харчаванне ў рэстаране, экскурсіі па гораду — і ўсё гэта па даступнай, чыста сімвалічнай цане: 50 тысяч беларускіх рублёў. Сапраўды пуцёўка каштуе значна болей, аднак, 95% ейнага кошту аплаціў студэнцкі прафсаюз.**

**У цяперашні час прафсаюз — адзіная арганізацыя, якая прытрымліваецца сваёй пачатковай мэты — усебаковай падтрымкі студэнцтва.**

**Узімку студэнты атрымліваюць пуцёўкі ў дом адпачынку "Нарач", на Карпаты ці турыстычны цягнік. І цана, як можна здагадацца, не б'е па кашальку сучаснага студэнта. Зараз у прафкаме ёсць пуцёўкі на лета ў лагеры працы і адпачынку. Нашыя студэнты змогуць не толькі добра адпачыць у Крыме, але і зарабіць грошай.**

---

*Афіцыйна*

# Аб памерах дзяржаўных стыпендый

Новыя памеры дзяржаўных стыпендый для навучэнскай моладзі ўведзены з 1 студзеня бягучага года. Яны зацверджаны сумеснай пастановай Міністэрства фінансаў і Міністэрства працы ў мэтах выканання Указа Прэзідэнта Рэспублікік Беларусь нумар 474 "Аб сацыяльнай падтрымцы навучэнскай моладзі".

Прынятай пастановай распрацаваны памеры трох відаў стыпендыі: імянных, сацыяльных і навучальных. Згодна з дакументам, самыя вялікія сумы чакаюць імянных стыпендыятаў. Тыя з іх, хто вучыцца ў ВНУ, атрымаюць імянную стыпендыю ў размеры 260% мінімальнай заработнай платы. Навучэнцам сярэдніх спецыяльных навучальных установ імянная стыпендыя назначана крыху меншая — 240 % мінімальнай зарплаты.

Па-іншаму выглядае намінацыя "навучальныя стыпендыі": у ВНУ — 160% мінімальнай заработнай платы, у сярэдніх спецыяльных навучальных установах — 135%.

Для той катэгорыі навучэнцаў, якія рашэннем ўраду пастаўлены на поўнае дзяржзабеспячэнне, навучальныя стыпендыі складуць у ВНУ — 80% мінімальнай зарплаты, а ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах — 70%.

Памер сацыяльнай стыпендыі ў ВНУ роўны 120% мінімальнай зарплаты. А ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах сацыяльная стыпендыя прыроўненая да мінімальнай зарплаты. 100% яе будуць атрымліваць і слухачы падрыхтоўчых аддзяленняў ВНУ з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. У гэты разрад атрымальнікаў уваходзіць таксама дзеці ваеннаслужачых, загінуўшых пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку, чыё забеспячэнне ўзяла на сябе дзяржава, слухачы падрыхтоўчага аддзялення спеваў і кампазіцыі пры Беларускай акадэміі музыкі.

Стымулам да дасягнення асаблівых поспехаў у вывучэнні асобных дысцыплін і ў навукова-тэхнічнай творчасці можа стаць для студэнтаў персанальная стыпендыя савета ВНУ, якая складае 210% мінімальнай заработнай платы.

Для пэўных груп навучэнскай моладзі пастановай прадугледжана надбаўка ў памеры 50% да ўстаноўленай стыпендыі. У першую чаргу ў дакументе названы тыя, хто атрымлівае ільготы ў адпаведнасці з артыкуламі 18-20 і 23-25 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС". На тую ж надбаўку могуць разлічваць студэнты вышэйшых і навучэнцы сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў з ліку былых ваеннаслужачых, якія сталі інвалідамі ў выніку ранення, кантузіі, калецтва ці захворвання, атрыманых пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку, а таксама інваліды першай і другой груп па зроку і глуханямыя.

50% устаноўленых памераў стыпендый кожны месяц будуць атрымліваць тыя, хто знаходзіцца ў акадэмічным водпуску па медыцынскіх паказаннях. Выплочвацца гэта сума будзе за кошт сродкаў навучальных устаноў на працягу ўсяго перыяду акадэмічнага водпуску.

Устанаўліваюцца ўсе вышэйназваныя стыпендыі ў адпаведнасці з інструкцыямі аб парадку назначэння і выплаты стыпендый студэнтам ВНУ ці навучэнцам сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі і навукі па ўзгадненню з Міністэрствам працы і Міністэрствам фінансаў.

Для назначэння навучальнай стыпендыі бал паспяховасці ў студэнтаў ВНУ гуманітарных, педагагічных і эканамічных спецыяльнасцей павінен быць не ніжэй чым 3.6, а прыродазнаўча-навуковых, тэхнічных, медыцынскіх, сельскагаспадарчых, ваенных спецыяльнасцей, а таксама ў навучэнцаў сярэдніх спецыяльных устаноў — не ніжэйшы чым 3.4.

Для тых, хто страціў права на атрыманне навучальнай стыпендыі і знаходзіцца ў цяжкім матэрыяльным становішчы, гэтай пастановай даецца выратавальная саломінка. Кіраўнікам вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў дазволена назначаць гэтай катэгорыі студэнтаў і навучэнцаў сацыяльную стыпендыю. Праўда, выкарыстаць гэтую магчымасць можна не больш не больш чым два разы за ўвесь перыяд навучання. Указаная стыпендыя назначаецца па прадстаўленню дэканаў факультэтаў (намеснікаў дырэктараў па навучальнай рабоце) па ўзгадненню з прафсаюзнымі, студэнцкімі (вучнёўскімі) арганізацыямі ў межах планавага стыпендыяльнага фонду.

# Агляд жаніхоў, ці Разважанні студэнтаў аб сямейным жыцці

***Калі Вам надакучыла вучыцца і захацелася выйсці замуж, трэба сур'ёзна абдумаць сваё становішча. Спачатку прааналізаваць сябе, улічваючы знешнія, унутраныя і матэрыяльныя фактары. А потым выбраць ахвяру. Першая справа даволі лёгкая, а вось другая... Дзе знайсці чалавека, які быў бы ўзаемна задаволены Вамі?***

***Вось у гэтым Вам дапаможа наша газета. Мы правялі апытанне на некаторых факультэтах і высветлілі, што каму падабаецца. Вось найбольш тыповыя меркаванні, па якіх Вы можаце вырашыць для сябе, дзе вучацца лепшыя хлопцы.***

Юрысты, напрыклад, збіраюцца ўступаць у шлюб не раней 25 гадоў. Як яны самі тлумачаць, дзяды рабілі гэта ў 23, бацькі — у 24, а яны будуць працягваць традыцыю продкаў (цікава, што ж будзе з іх сынамі?). Перавагу аддаюць прыгожым і паслухмяным жанчынам. Неабавязковы розум, каб не сказаць непажаданы, але калі ўжо трапілася такая, дык давядзецца ёй пры сваім мужы выконваць ролю неразумнай жонкі. Калі яна гэта добра разумее, то будзе жыць, як у казы: вялікі дом, машына, спакойнае месца недалёка ад горада. Давядзецца ва ўсім падпарадкоўвацца мужу, затое ён такую жонку будзе насіць на руках.

На першым месцы ў юрыстаў — дзеці. Амаль кожны лічыць, што двух яму хопіць, а для процідзеяння разлічваюць на аднаго хлопчыка і адну дзяўчынку, якіх яны пры магчымым разводзе пакінуць жонцы.

**Міжнароднікам** таксама падабаюцца прыгожыя дзяўчаты з добрымі фігурамі. Калі Вам уласцівыя адметнасць і выразнасць, то ёсць шанц спадабацца ім, нават калі Вы валодаеце разумовымі здольнасцямі (галоўнае, каб былі не разумней за мужа). Міжнароднікі — познія птушачкі. Бяруць шлюб у 28 год, і тое ў экстрымальных умовах. Але, калі ажаніліся, наўрад ці развядуцца. Такая рэч адбудзецца толькі ў выпадку адыходу жонкі ад сямейных спраў і недагляду дзяцей, якіх гэтыя хлопцы горача будуць любіць і з якімі не растануцца ні пры якіх абставінах (у тым ліку і разводзе). З усіх факультэтаў толькі яны лічаць, што чым больш дзяцей, тым лепей. Праўда, яны збіраюцца час ад часу падкідаць гэтае шчасце бацькам.

Калі Вам патрэбныя аматары гармоніі, звярніцеся да **фізікаў** — яны ўсё робяць гарманічна: і гаспадарку, і сям'ю, і дзяцей. На пытанне "Чаму хочаце менавіта дваіх дзяцей?" быў атрыманы адказ: "Аднаму дзіцяці будзе сумна, а больш двух — жонцы цяжка". Чаму хлопчыка і дзяўчынку? Зноў жа — гармонія.

Фізікі лічаць, што сям'я вялікая адказнасць, яна патрабуе сталасці, якой можна дасягнуць, на іх думку, у 24 гады. Да гэтага часу маладыя людзі знойдуць гаспадарлівую бландзінку, розум якой — 50% ад мужчынскага. Жыць будуць як атрымаецца, грошы зарабляць — разам. А калі ў хаце запануюць разуменне і згода, будучыя навукоўцы пачнуць дапамагаць жонцы ці ўвогуле возьмуць яе клопаты на сябе. Галоўнае, каб было духоўнае разуменне.

Фізікі на 99% упэўненыя ў сваёй непадатнасці на іншых жанчын. Калі ж іх слабая палова спакусіцца на кагосьці іншага і здрадзіць, муж не будзе даводзіць справу да разводу, а проста адпомсціць ёй тым самым. У выпадку рознагалосся паміж маці і нявесткай фізфакаўцы падтрымаюць другую. Пры неабходнасці растацца — падзеляць нашчадкаў напалам: у выхаванні і матэрыяльным забеспячэнні свайго дзіцяці яны разлічваюць на дапамогу бацькоў.

Калі Вы не вылучаецеся нічым асаблівым, звярніцеўвагу на **хіміка**. Тут патрэбна трошкі вясёлая, трошкі добрая, з доляй разумення дзяўчына, магчыма, прыгожая, а ў цэлым — самая звычайная. Матэрыяльны бок хіміка не хвалюе, ён не запатрабуе чагосьці "звыш", але захоча, каб усё было спантанна. Шчасце яго складуць двое дзяцей (адзін — мала, тры — многа).

У іншым меркаванні хімікаў падзяліліся. Адна палова сцвярджае, што наўрад ці здрадзіць жонцы, другая — што ўвесь час толькі гэтым і будзе займацца. Адны кажуць, што на здраду жонкі адрэагуюць па-рознаму (гледзячы, з кім яна гэта зробіць), а другія — што каханая мае права абыходзіцца з імі так, як і яны з ёй (здрада на здрадзе, і ўсё добра). Першыя мяркуюць, што пры сутыкненні жонкі са свякрухай яны падтрымаюць першую, другія адказваюць, што проста ўцякуць з дому на пэўны час. Усё тыя ж першыя пакінуць дзяцей пры разводзе ў сябе, другія — у жонкі.

Якая разнастайнасць! Выбірай на любы густ!

Хлопцы з ФПМІ прынцыпова дачакаюцца 27 гадоў (тры ў кубе) ці наогул не ажэняцца. Матэматыкі даволі загадкавыя асобы са спецыфічным пунктам погляду. П'юць, кураць, гуляюць, але аддаюць перавагу добрым, па іх выразу, дзяўчатам: вытанчаным, разумным, крыху дзеланым, сціплым, прыгожым і стройным. (Самыя патрабавальныя з усіх.)

Большасць выказала жаданне мець двух дзяцей, пераважна хлопчыкаў, падобных да дзеда (вельмі ж ужо продкаў шануюць).

На працягу апытання матэматыкі адказвалі даволі разнастайна, але часам здзіўлялі сваёй патрыярхальнасцю. Усе выказалі думку, што мужчына павінен быць галоўным у сям'і і кіраваць жонкай. Калі ж наступіла чарговае пытанне ("Ці абавязкова жонцы працаваць?"), яно ўразіла іх да глыбіні душы: "Канешне! А хто ж сям'ю карміць будзе?!"

З вернасцю ў матэматыкаў справы ідуць наступным чынам:

1. "Сам, магчыма, здраджу (гледзячы з кім), а калі жонка такое зробіць — заб'ю і яе, і палюбоўніка на месцы злачынства";

2. Пачатак аналагічны папярэдняму, а наконт жонкі: "Не ведаю, што зраблю, але на развод не пайду, бо яна для мяне — галоўнае".

Цікавыя погляды ў **геафакаўцаў**. Ім здаецца, што найлепшы ўзрост для шлюбу — 60 гадоў. Маўклівая даўганогая дзяўчына — найлепшы варыянт. Дзяцей выхоўваць будуць сабака, Карлсан, суседзі; адным словам, усе, толькі не іх бацькі. На першае месца ў сямейных адносінах геафак ставіць секс. Дапамагаць па дому геолагі не збіраюцца, пры сварках сваёй паловы са свякрухай станучь на бок дзяцей.

Адным са сваіх адказаў географы літаральна знішчылі ўсю мужчынскую годнасць папярэдніх факультэтаў. У адказ на здраду каханай яны збіраюцца... вешацца. А пры разводзе лічаць больш гуманным пакінуць дзяцей з цешчай.

У пэўнай ступені адрозніваецца ад іншых **журфак**. Тут 25 год — крытычная мяжа. Журналісты цэняць слабую палову чалавецтва, як Оскар Уайльд, які сказаў: "Я люблю мужчын з будучыняй і жанчын з мінулым". А яшчэ разумных, верных, з пачуццём гумару і сексуальна прывабных. Жаданне мець менавіта двух дзяцей тлумачаць па-рознаму:

1. Большая верагоднасць нарадзіць тое, што трэба;

2. Адно дзіця ў сям'і хутчэй за ўсё вырасце эгаістам, таму гэты варыянт выключаецца. А забяспечыць усім і даць паўнавартаснае выхаванне можна толькі двум.

Узнікае пачуццё, што будучыя "пісакі" прадумалі свой шлюб да дробязяў на 20 год наперад. "Жыць будзем без бацькоў, не ў доме, а менавіта ў кватэры. Раніца пачнецца з сексу, затым — снеданне, а пасля — праца. Увечары — культурны адпачынак і, нарэшце, спатканне з агульнымі сябрамі (бо журналісты — людзі кампанейскія). Дзеці выхоўваюцца так: яна плюс маё ўмяшанне. Магчыма, дапамагу па гаспадарцы (што-небудзь згатую).

Першыя пяць год мы жывем па плану, потым жонка надакучыць, і пачну падгульваць. Пры ейнай здрадзе — заб'ю (калі будзе час). І ўвогуле, здрадзіць яна мне зможа толькі адзін раз".

Не ўмешвацца ў сваркі і заўсёды заставацца "на сваім баку" — вось іх прынцып.

Выказалі свае меркаванні і студэнты Беларускага універсітэта **культуры**: жонка — бландзінка з блакітнымі вачыма, стройная, 170 см, разумная. Яны лічаць за лепшае ўступаць у шлюб да 17,5 гадоў, імкнуцца хутчэй арганізаваць жыццё. Разлічваюць на двух дзяцей, бо не жадаюць рабіць убытку чалавецтву, але і прыросту садзейнічаць не збіраюцца. Адносіны да сям'і такія: жонку — кахаць, з дзецьмі абыходзіцца строга, але справядліва.

"Працаваць буду сам, ёй жа гэта рабіць не абавязкова. А захоча — забараняць не буду. Закіне гаспадарку — зразумею. Непрымальная рэч у сям'і — здрада. На гэта і сам не пайду, і жонцы не дарую. У выпадку разводу дзелім дзяцей напалам. Сабе пакіну хлопчыка". (Дык вось чаму двое дзяцей — падзяліць лягчэй.)

Самымі сур'ёзна настроенымі з усіх апытаных аказаліся будучыя псіхолагі з БДПУ. Амаль на усе пытанні яны адказвалі: "Гледзячы па магчымасцях і абставінах (якім чынам, дзе, калі, з кім і чаму)". Іх шлюбны тэрмін — 30 год. Ідэал жонкі — разумная і не вельмі брыдкая. Некаторых хвалюе матэрыяльнае становішча. Нашчадка дастаткова і аднаго, тым больш, што мэтай з'яўляецца выхаванне эгаіста: "Можа, ён і будзе дрэнным, але затое яму будзе добра!" Жонка працаваць не павінна, яна павінна "вкалывать". "Здрада? Так, магчыма. Яна? Лепш, каб я пра гэта не даведаўся..."

Як бачыце, да сямейнага жыцця студэнты так ці інакш рыхтуюцца.

Спадзяемся, што наш агляд дасць вам пэўны накірунак і дапаможа ў выбары мужа. Па больш падрабязную інфармацыю раім звяртацца непасрэдна да прадстаўнікоў факультэта, які вам імпануе.

***Валерыя Аўсянік***

---

# "Не ўсе мы згінем..."

## Рэцэнзія на апошні раман І. Чыгрынава

Зусім нядаўна з жыцця пайшоў народны пісьменнік Беларусі, колішні выпускнік факультэта журналістыкі Іван Чыгрынаў. Ён па праву насіў званне народнага: раманы, п'есы, апавяданні, кнігі крытыкі і публіцыстыкі, сцэнарыі шматсерыйных фільмаў. Акрамя таго — актыўная грамадска-палітычная праца, рэдагаванне часопіса "Спадчына", кіраванне Беларускім фондам культуры.

"Я быццам увесь час стаю пад ваенным дажджом",— сказаў неяк Іван Гаўрылавіч. Яго пакаленне — "дзеці вайны", і, напэўна, таму тэма вайны — адна з галоўных у творчасці. Ёй пісьменнік прысвяціў свой вядомы "Верамейкаўскі цыкл". Пяць раманаў, звязаных аднымі героямі і адным месцам дзеяння,— з'ява наогул унікальная. Свой апошні раман "Не ўсе мы згінем..." пісьменнік дапісаў, здаў у рэдакцыю, але выхаду яго не дачакаўся. Раман быў надрукаваны ў часопісе "Полымя" (№ 1 за 1996 год), калі аўтара ўжо не было ў жывых.

Глыбокі сэнс у самой назве твора. Чыгрынаў верыў у свой народ, верыў у яго будучыню і гэтай верай прасякнута ўся яго творчасць. Апошні раман не столькі ці, можа, не толькі пра гераізм народа, колькі пра драматызм жыцця людзей на акупаванай тэрыторыі. Лёс так званага мірнага насельніцтва.

Мы зноў сустракаемся са старым партызанам Дзянісам Зазыбам, які цяпер стаў першым дарадцам і памагатым генерала Земанадольскага. Калісьці яны ваявалі ў адной дывізіі, і праз увесь твор былы куляметчык і ротны праходзяць поруч. Сын Дзяніса, беларускі паэт Масей Зазыба, вярнуўшыся з высылкі ў Сібір, трапляе ў чарговую пастку. За тое, што заступіўся перад паліцаем за суседа, ён змушаны працаваць пісарам у немцаў. А пасля недарэчнай смерці маці становіцца Масея робіцца зусім невыносным, і ён пакідае хату, едзе ў Мінск.

Вайна паказала, хто ёсць хто. Акрамя таго, яна шмат каго прымусіла па-іншаму паглядзець на свет, па-іншаму асэнсаваць і сваю мінуўшчыну. У цяжкія моманты жыцця і ўвесь народ і кожны чалавек у асобку заўсёды задумваюцца: як жылі і як жыць будзем, што здарылася і хто вінаваты? Ці можна было прадухіліць Вялікую Айчынную, ці можна было здабыць перамогу з меншымі ахвярамі? Як рэпрэсіўная сістэма 30-х гадоў паўплывала на ходу падзеяў? А роля яе, Сістэмы, тут велізарная. Яна вызначала ўсе аспекты жыцця. Усё было проста: вось — чорнае, а вось — белае; гэта — сябры, а гэта — ворагі. І ніякіх сумненняў! Сістэма не цярпіць іншадумцаў, іх быць не павінна. Так і ў час вайны. Дагадзіць вышэйшаму начальству, дапісаўшы ў справаздачы патрэбную колькасць лічбаў і працэнтаў,— справа першачарговай важнасці. Так, адзін неардынарны начальнік (Маштакоў) вымушаны прызнацца сам сабе: "Мала зроблена атрадам, а выдумана шмат". Пра падараваныя цягнікі партызаны напісалі — 18, а на самой справе іх было толькі 2. Не невялікі атрад хапіла б і гэтых двух, тады навошта хлусіць? Але што здзіўляцца? Гэтыя прыпіскі пачаліся яшчэ ў мірны час, калі кіраўнікам спатрэбіліся працэнты, асабліва пры стварэнні калгасаў. Дый не толькі тады.

У сваім апошнім творы І. Чыгрынаў дэталёва паказаў жыццё мірнага насельніцтва, якое апынулася пад акупацыяй. Менавіта жыццё, бо народ у вайну не толькі ваяваў. Людзі аралі і сеялі хлеб, збіралі ўраджай і трымалі гаспадарку. Яны кахалі, стваралі сем'і і гадавалі дзяцей. А яшчэ — разлічваліся за ўсе справы і партызанаў, і немцаў. За чужыя справы. "...Чалавек з ружжом — не тое, што чалавек без ружжа. Чалавек без ружжа бяссільны перад чалавекам з ружжом. Ну, а помста? Дзе яе межы?" Зразумела, чым больш актывізаваліся партызаны, тым мацней лютавалі немцы. Вось і атрымлівалася, што сёння чалавек за нешта вінаваты перад аднымі, а заўтра за тое ж — перад другімі. І бясконцыя паборы. Адзін раз паліцаі свінчо ловяць на выгане, другі — партызаны. Дык дзе тая мяжа, якая павінна аддзяляць заступніка ад акупанта?

Гуманізм на вайне. Ці ёсць ён, ці павінен быць? Вельмі яскрава пададзены эпізод з допытам савецкага лётчыка, які адмовіўся бамбіць лагер ваеннапалонных, пасадзіў самалёт і трапіў да ворага. Цяпер ён лічыцца здраднікам. Але бамбіць лагер з ваеннапалоннымі — хіба гэта не чалавеканенавісніцтва? Можа, лётчык зрабіў тое, што павінен быў зрабіць кожны прыстойны чалавек? Вайна, бой, страх смерці — усё гэта раскрывае і "вымярае" чалавека, ягоную "столь" і ягонае "дно". Для іншых раскрывае і для сябе. Бо і пра сябе чалавек не ўсё ведае. Вайна раскрывае чалавеку вочы на многае. Што па-за ім. І што ў ім самім. І што "над ім". Але ўлада... улада ніколі не разумее чалавека. Вось і атрымліваецца, калі "няма самалётаў, няма танкаў, няма артылерыі — затыкай дзіркі людзьмі!". І ўсё адно: патрыёт ты ці здраднік,— бо патрэбны матэрыял, з якога можна збудаваць перашкоду.

Моцна гучыць у рамане ідэя нацыянальнага адзінства. Вобраз Масея Зазыбы, Алеся Астрашаба, папа Дворскага складаныя і драматычныя. Так, беларускі паэт Масей Зазыба адсядзеў "тэрмін" у Сібіры, Астрашаб некалі спадзяваўся на прыход немцаў у Беларусь (яму здавалася, што пад шырмай акупацыі можна будзе што-небудзь зрабіць для беларускай справы), поп Дворскі хоча гэтым часам адпраўляць службу ў царкве па-беларуску. Гэта людзі, якія шмат нацярпеліся і ад Савецкай улады, і ад фашысцкага рэжыму. У памяці Масея Зазыбы, напрыклад,— розныя партызаны. І той, што забіў яго маці Марфу Давыдаўну, таксама. Жонка героя-партызана Дзяніса Зазыбы гіне ад рукі яго паплечніка. Вось і атрымліваецца, што ад Савецкай улады не абароніць нават геройства. А дзе тая мяжа, што павінна стрымліваць гэтую дзікую ўседазволенасць, калі кожны сабе і пракурор, і суддзя, і выканальнік свайго ж прысуду? І гэты жах — поўная беспакаранасць вінаватых і пакаранне нявінных. І таму такімі зразумелымі з'яўляюцца словы Масея: "Не хачу я зноў апынуцца ў канцлагеры ў Сібіры..." І беларускія патрыёты не падманваліся ні наконт Савецкай улады, ні наконт акупантаў, "яны моцна пачувалі сябе людзьмі тутэйшымі, гэта значыць беларусамі, дарэчы, якія ні бальшавікам, ні немцам, калі разважаць шчыра, не патрэбны былі. Маўляў, штосьці прамежкавае — ні народ у выразным значэнні гэтага слова, ні нацыя".

І вось пір у часе чумы — правядзенне ў Мінску Другога ўсебеларускага кангрэсу. "Здавалася, гістарычны лёс злітуецца над Беларуссю хоць у гэтым — не стане шкодзіць у правядзенні чарговай хімеры". На другі дзень пасля кангрэсу цягнік адвозіў беларусаў у эміграцыю. Зыход з этнічнай радзімы быў непазбежны, бо выбару не было: альбо Сібір, альбо Еўропа. Бадай, гэта быў першы вялікі зыход.

"Не ўсе мы згінем..." — раман у пэўным сэнсе незавершаны. Мы не ведаем пра далейшы лёс герояў. Можна толькі меркаваць, як складзецца жыццё старога Зазыбы па вяртанні ў сваю абвугленую вёску, як і дзе будзе жыць яго сын Масей, які наўрад ці калі вернецца дадому... Застаецца толькі здагадвацца. Можа, аўтар хацеў даць працяг у наступным творы, а можа, пакінуў гэтую "незавершанасць" на дадумванне сваім чытачам? Магчыма. Але як бы там ні было, у творы Чыгрынаў стараўся паказаць жыццё ўсебакова. І яму гэта ўдалося.

***Святлана Шаблінская***

# Этих не сведут с ума римляне и греки

*Класс живых существ: СТУДЕНТ. Относится к вымирающим. До сегодняшнего дня сохранилось несколько видов.*

Среди студентов Литинститута ходит такая байка: "Встретились Лев Толстой и лев простой. Всё." А почему вы не смеетесь? Краткость — сестра таланта, а талантливыми люди становятся, поучившись некоторое время в стенах вуза. Талант этот особого свойства. Он предполагает умение складывать и понимать подобные байки.

Дело в том, что из простого студента со временем вылупливатся ТИП. Это в определенном смысле, конечно, студент, но только частично. Попросту это можно назвать синдромом Джекила-Хайда.

**1. Тип ботанический (компьютерщик)**

Компьютерщик подвижен, остроумен, в массовых мероприятиях практически бесполезен. К этому типу можно отнести скопом всех студентов физматов и прочих естественно-научных факультетов.

Внешне это худоватые, компанейски одетые (то есть в свитер или немодный пиджак) молодые люди. Кушают мало, поэтому выгодно с ними дружить, натура у них весьма поэтическая, что они тщательно скрывают. Общаются мало и по делу.

Наблюдатели отмечают, что студент-математик, он же программист, вскоре после проникновения в тайны общения с экраноглядящей машинкой начинает оставаться на рабочем месте допозна и ночует на коврике возле компьютера. Сборища студентов, изучающих точные дисциплины,— очень весёлые, но над чем они смеются, простому наблюдателю никогда не понять, поэтому он смотрит на группку этих человеков с большим опасением. Послушали бы вы хотя бы их анекдоты:

— Я набил несколько перфокарт. Перфокарты располнели, стали мягкими, как подушки, и временами из них вылезал пух.

Или:

— Ю хев нот сеч пробирок, поэтому цвет и запах будут выведены на экран.

Еще:

— В ИНМОСЕ есть игровой пакет, в который входит известная игра АДВЕНЧУР с маленьким добавлением. В домике введена еще одна комната. Когда вы в нее "входите", выдается сообщение: "Вы находитесь в комнате, где стоит много терминалов. Вы сидите перед одним из них и тупо смотрите на экран". И игра заканчивается...

Вообще-то они — милые ребята, хотя и бесполезно просить их перенести для вас что-нибудь тяжелое (кроме компьютера, конечно). Но в том, что касается помощи по компьютерному обеспечению, вы можете положиться на студента-компьютеромана. Даже если он не знает, как помочь, все равно возьмется за дело из положительного чувства честолюбия. В их жизни есть одна печаль: как и все остальные, девушки компьютероманов только уважают, а иногда студенту требуется большее. Тогда компьютерщики влюбляются в компьютеры и пишут стихи:

Ты меня на рассвете
разбудишь,
Тумблерами пощелкав
минуту,
Ты меня никогда
не загрузишь,
Систем-диск же ты
продал кому-то!
При попытке загрузки
системы,
Тут я честно скажу —
Эррор 30,
Зря влюбился ты в
кнопки,модемы.
Плачь, но цели тебе
не добиться!

На наших глазах эти суперсовременные сливки учащейся молодежи превращаются в типичных язычников: компьютерам дают имена, в задумчивости поглаживают их по пластмассовым бокам, а иногда по ночам, вопреки инструкции, украшают их цветами. Но тревожнее всего то, что не только юноши, но и многие талантливые девушки остаются наедине с этими загадочными устройствами. Так что будьте осторожны, бабушки и дедушки, ваши внуки могут вас удивить.

**2. Тип политический**

Политический студент общителен, говорлив, в одежде разнообразен до крайностей. Раньше этот активный ТИП был разбит на кучки рокеров и прочих храбрящихся молодых людей. Вот как описывает сегодняшнее состояние авангардной молодежной политтусовки ее активный участник — панк и анархист Алексей:

— Около года назад с нами случилось что-то странное. Во-первых, все новые андеграундные молодежные ручейки и реки пошли по левому руслу. Во-вторых, сгруппировались люди, казалось бы, несочетающиеся: анархисты и комсомольцы, экологические бойцы и рокеры, в конце концов появилось даже нечто новое — партизаны. Все элементы внутриполитического подвида постоянно передвигаются, меняются местами, но с завидным постоянством участвуют во всевозможных акциях. В Одессе такие сборные отряды остановили строительство нефтетерминалов (отходы производства планировалось сбрасывать в залив, населенный всякой уникальной живностью). Проделали это ребята путем висения на стрелах кранов и окружения места строительства. Партизаны (тоже политические), увидев как-то утром, что полянка их ежегодного тусовища застраивается нуворишами, построили большую баррикаду за ночь. Утром и весь день богатые дядьки разгребали завалы, а потом снова стали строить свои дачки.

ПОЛИТИЧЕСКИЕ учатся в основном в гуманитарных вузах. Все они люди творческие: пишут, изучают право, берут интервью, готовят себя в политические деятели или в свободные художники. Большую часть времени они проводят вне дома: на учебе (чтобы не выгнали) и в кабачках, на кухнях, на улице, где можно поболтать о своем или совершить какую-нибудь акцию. Они открыто и прямо выступают против каких бы то ни было войн, а чтобы привлечь к себе внимание, Алексей, например, придумал "игрушечный терроризм". Это когда все взрывается и искрит, но никто не гибнет, потому что не бомбы взрывают, а пиротехнику используют.

Отличие ПОЛИТИЧЕСКИХ от их "предков" — это антибуржуазность и антииндустриальность. Их любимое событие — французская революция 68-го года, лозунг — "Будьте реалистами, требуйте невозможного!" Они считают, что живут в обществе видеоклипа и зрелища, поэтому пытаются жить по соответствующим законам. Несмотря на это, половина ПОЛИТИЧЕСКИХ — глубоко религиозна и считает, что Россия очистится только путем всеобщего уверования. Другая половина, наоборот, считает религию опиумом, для них первична в мире эстетика, а не внутреннее содержание предмета, потому что внутри, под красивой оболочкой, зачастую бывает гадость. Среди ПОЛИТИЧЕСКИХ — большинство мальчиков, но там, где надо провести какую-нибудь акцию, вдруг в несметных количествах появляются девочки, так что состав движения вполне пропорциональный.

Несмотря на телевизионность ПОЛИТИЧЕСКИХ, они все-таки люди книги. Любимые книги, которые назвал Алексей:

Набоков, "Приглашение на казнь".

Стругацкие, "Отягощенные злом, или 40 лет спустя".

Саша Соколов, "Школа для дураков".

А еще Леша добавил, что левизна "навязана нам обществом", а дикий, пещерный коммунизм, к которому многие ПОЛИТИЧЕСКИЕ стремятся, вызван ненавистью к нахальной западной цивилизации.

**3. Тип в стиле гранж**

Первое, что бросается в глаза у этого ТИПа,— его одежда. Если на Западе, где стиль возник, люди по прозвищу "помоечники" протестовали своим способом одеваться против своих сверстников, которые были "упакованы" от Кардена, то у нас все произошло иначе: когда стиль стал стареть, в магазинах появилось дорогостоящее гранжовое "рванье", богатенькие буратинки бросились скупать и натягивать эти вещицы в качестве супермодных.

Меж тем есть у нас в России и народный ГРАНЖ. Гранжовый студент тих и вполне благопристоен, он не вскакивает и не бегает посредине лекции, он будет исправно учить уроки, а если и возмутится чем-то, то только в узком кругу. Это студенты негуманитарных факультетов, в силу непонятных обстоятельств наделенные талантами, прямо противоречащими их будущей специальности. Они учатся на химиков, инженеров, физиков, врачей, а в свободное от учебы время великолепно рисуют, шьют на себя (даже мальчики), поют, пишут, играют на музыкальных инструментах и даже подрабатывают этим.

Их основной девиз — "Одеваться надо удобно!".

Наташа, студентка 3-го курса:

— Мне нравится стиль ГРАНЖ еще и потому, что никто мне не завидует. Наоборот, люди смотрят на мой вязанный колпак и говорят: "Ты как гномик!" Когда люди смотрят на меня — они не злятся, а улыбаются, и мне это ужасно нравится. Людям весело, что может быть лучше?

Культовых книг у нас нет, но я назову то, что нравится мне. Из писателей — это Борхес и Кафка, фильм — "Маска", групы — "Нирвана" и "Рет хот чили пеперс".

Вообще-то наша культура клиповая, но не липовая, и несмотря на то, что все смотрят только на мою оболочку, ты ведь понимаешь, не в одежде суть!..

Ну а к какому типу принадлежите вы, решайте сами.

*"КП"*

# Пекла — гэта ...толькі атракцыён?

***Клуб творчай інтэлігенцыі "На ростанях" арганізаваў сустрэчу з трыма маладымі рэжысёрамі: Ірынай Волах, Вольгай Марчанка і Аленай Трафіменка. Вашай увазе мы прадстаўляем рэцэнзію Юліі Васілішынай, студэнткі 4-га курса факультэта журналістыкі, на фільмы гэтых рэжысёраў. Спадзяемся, што гэтая рэцэнзія зацікавіць аматараў беларускага кіно і тых, хто не абыякавы да яго далейшага лёсу, а таксама тых, хто цікавіцца развіццём беларускай кінакрытыкі.***

Маладосць рэжысёраў у гэтым выпадку не азначае нявопытнасць, бо кожная з іх не толькі зняла не адзін фільм, але і паспела паўдзельнічаць у міжнародных кінафестывалях. Карціны, якія складалі праграму, адрозніваліся як тэматыкай і стылем, так і ступенню ўздзеяння на гледача.

Фільм Алены Трафіменка "Пекла — гэта..." паводле п'есы Ж.-П.Сартра "За зачыненымі дзвярыма" выклікаў раздражненне і расчараванне. Чамусьці не хацелася верыць, што кампанія даволі сімпатычнай моладзі, якая сабралася ўвечары пакатацца на "коле агляду", і ёсць грэшнікі, якія знаходзяцца ў пекле. Увогуле, "кола агляду" — даволі мірнае збудаванне, і думка пераўтварыць яго ў пякельныя колы даказвае наяўнасць у рэжысёра немалой фантазіі. Але на працягу ўсяго фільма не забывалася, што ўвасабленне пекла — усяго толькі атракцыён. Боязь, мана, эгаізм, нянавісць, якія заразілі свет, людзі, што жывуць пакутамі іншых, — усё засталося ўбаку, хаця з вуснаў герояў і ліўся сартраўскі тэкст. У дадатак да гэтага дзеянне суправаджалася рэзкім дыскатэчным святлом. Гэтак сартраўская спавядальнасць і згінула.

Фільм Ірыны Волах "Рандэву" паводле аповесці У.Арлова "Рандэву на манеўрах" даставіў чыста эстэтычнае задавальненне. Дзеянне на экране адносіцца да XIX стагоддзя. Паненка, афіцэр, лёгкі флірт, выпадковае слова ў размове — і разгортваецца цэлая гісторыя. Гэтую карціну можна параўнаць са старадаўнім фотадзымкам. Па-першае, колеры: матава-парцалянавы, цёпла-карычневы, бежавы. Колеры, якія наводзяць на думку аб старых сямейных альбомах. Па-другое, дзеянне. Як і фатаграфія, фільм адлюстроўвае толькі нейкі момант жыцця персанажаў. А паколькі мы ведаем, што нешта папярэднічала гэтаму моманту і працягвала яго, мы вымушаныя дадумваць гісторыю самі. Недагаворанасць надае гэтаму фільму надзвычайную прывабнасць.

Карціна ж Вольгі Марчанка "Выпадак з практыкі" паводле апавядання А.Купрына наводзіла хутчэй на думку аб Чэхаве. Чэхаўская атмасфера адчувалася ва ўсім: і ў тым, што дзеянне адбывалася ў вар'ятні, і ў пажоўклай асенняй лістоце, злёгку прысыпанай снегам, і ў спалучэнні жоўтых, карычневых і брудна-белых таноў. Пачуццё шчымлівага суму і страчанасці абуджае гэты фільм. І выказванні кшталту "Каб знішчыць зло, патрэбна навальніца. Хай яна знясе палову свету, зато астатнім будзе лягчэй дыхаць!" непрыемна казычуць нервы. Ды яно і няблага, абы не быць абыякавым.

Пасля прагляду кінастужак адзінага ўражання аб новай рэжысуры, наогул, не склалася. Надта ж карціны разнапланавыя, і знайсці ў іх нешта агульнае, апроч маладосці іх стваральнікаў, не ўдалося. А можа, у непадобнасці і ёсць адзінства?

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Заснавальнік газеты - рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Мінская паліграфічная фабрыка "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.

*Газета падпісана ў друк у 12.00.*

*25 красавіка
Зак. 2004.
Т. 1000 экз.*

*220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 206827.*

В.а. рэдактара
Т.М. Казак